ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 7 (567) | Субота, 3 сакавіка 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап




## 8-га сакавіка — Міжнародны жаночы дзень

ПРАЗ чатыры дні, у наступны чацвер, савецкія людзі, уся сусветная прагрэсіўная грамадскасць урачыста адзначаць 8 Сакавіка — дзень інтэрнацыянальнай салідарнасці жанчын у іх барацьбе за эканамічнае, сацыяльнае і палітычнае раўнапраў'е, за мір, дабрабыт і шчасце дзяцей нашай планеты.

Міжнародны жаночы дзень 8 Сакавіка быў устаноўлены ў 1910 годзе на 2-й Міжнароднай канферэнцыі сацыялістак як дзень міжнароднай салідарнасці працуючых жанчын у барацьбе за раўнапраў'е. Упершыню гэты дзень быў адзначаны ў 1911 годзе ў Германіі, Аўстрыі, Швейцарыі і Даніі пад лозунгам «Выбарчыя правы работніцам для аб'яднання сіл у барацьбе за сацыялізм».

У нашай краіне свята 8 Сакавіка стала сімвалам глыбокай павагі да жанчыны, яе раўнапраўнага становішча ў сацыялістычным грамадстве. Сёлета гэты дзень адзначаецца ў абстаноўцы працоўнага і палітычнага ўздыму, выкліканага падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў у Вярхоўны Савет СССР, гарачым імкненнем паспяхова ажыццявіць шырокую праграму эканамічнага і сацыяльнага развіцця, вызначанную XXVI з'ездам КПСС, наступнымі Пленумамі ЦК КПСС і, у прыватнасці, нечарговым лютаўскім Пленумам Цэнтральнага Камітэта партыі, на якім з прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш К. У. Чарненка.

Яркім сведчаннем вялікага прызнання савецкіх жанчын стануць выбары ў Вярхоўны Савет СССР, якія адбудуцца заўтра. У гэты дзень савецкія людзі аддадуць свае галасы і за многіх слаўных дачок сацыялістычнай Айчыны. Прыемна, што напярэдадні свята жанчын калектыў нашага універсітэта будзе галасаваць за кандыдата ў дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 84, адну з лепшых прадстаўніц рабочага класа ардэнаноснага горада над Сожам, вязальшчыцу фабрыкі «8 Сакавіка» Вольгу Якаўлеўну Капытка.

## СВЯТА СЛАЎНЫХ ПРАЦАЎНІЦ

Савецкія жанчыны адразу ж пасля перамогі Вялікага Кастрычніка па праву сталі паўнаўладнымі гаспадынямі сваёй краіны. Цяпер імі ствараецца прыкладна палова усіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей СССР. Больш 90 працэнтаў савецкіх жанчын працаздольнага ўзросту заняты ў розных галінах народнай гаспадаркі, або вучацца, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

Сёння нельга не прывесці такія лічбы. Па даных перапісу насельніцтва 1897 г. у царскай Расіі 83,4% усіх жанчын былі непісьменнымі. Усяго толькі 535 тыс. жанчын мелі адукацыю вышэй пачатковай. Па перапісу 1979 г. колькасць жанчын з такім узроўнем адукацыі склала 70,8 млн. чалавек.

Пастаянна павялічваецца колькасць жанчын у саставе радоў КПСС. На 1 студзеня 1983 г. у радах партыі знаходзілася 4 968 683 жанчыны. Гэта 27,4% усяго саставу КПСС.

Камуністычная партыя, савецкая дзяржава на ўсіх этапах сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва няўхільна праводзяць у жыццё запаветы У. І. Леніна аб раўнапраўі жанчын. Клопаты аб сістэматычным паляпшэнні іх становішча, павышэнні ролі ва ўсіх сферах грамадскага жыцця ўзведзены ў нас на ўзровень дзяржаўнай палітыкі.

Аб высокім становішчы савецкай жанчыны ў сацыялістычным грамадстве можна гаварыць і на прыкладах нашага універсітэта. Амаль 40% прафесарска-выкладчыцкага саставу — жанчыны. 56 з іх маюць вучоныя ступені і званні. Дацэнты Т. І. Язэпава, А. В. Саннікава з'яўляюцца дэканамі адпаведна гісторыка-філалагічнага і завочнага факультэтаў. Адметнай з'явай стала імкненне савецкіх жанчын да вышэйшай адукацыі. Большая палавіна кантынгенту студэнтаў нашага універсітэта — жанчыны. Сёння мы па праву ганарымся ленінскімі стыпендыяткамі студэнткамі фізічнага факультэта Наталляй Федарцовай, Наталляй Кандратавай, Святланай Курылкінай, Ірынай Даманцэвіч з эканамічнага, Аленай Яроменка і Валянцінай Малашанка з матэматычнага факультэтаў і многімі іншымі выдатніцамі вучобы і грамадскімі актывісткамі.

Студэнтка эканамічнага факультэта Ларыса Бурава выбрана членам парткома ГДУ і кандыдатам Цэнтральнага РК КПБ.

Лепшыя прадстаўніцы нашага універсітэта кожны раз выбіраюцца дэпутатамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Цяпер дэпутатамі гарадскога Савета з'яўляюцца студэнтка біялагічнага факультэта Галіна Пашчанка і нядаўняя выпускніца ГДУ, асістэнт кафедры беларускай літаратуры В. К. Шынкарэнка.

На бацькоўскія клопаты партыі і ўрада аб савецкіх жанчынах яны адказваюць самаадданай працай, старраннай вучобай, настойліва змагаюцца за паспяховае выкананне заданняў пяцігодкі, павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, ашчаднасць і эканомію, умацаванне працоўнай, вытворчай і вучэбнай дысцыпліны, уносяць важкі ўклад у рэалізацыю Харчовай праграмы краіны. Савецкія жанчыны з'яўляюцца актыўнымі барацьбітамі за прадухіленне вайны, умацаванне міру ва ўсім свеце, выступаюць у першых радах міжнароднага дэмакратычнага жаночага руху.

З надыходзячым святам Вас, нашы слаўныя жанчыны, актыўныя будаўніцы камуністычнага грамадства!

**Г. ВЕТЛУГАЕЎ,**
**намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце, дацэнт кафедры палітэканоміі.**

*ЗАЎТРА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫ САВЕТ СССР. АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТАЎ НЕПАРУШНАГА БЛОКУ КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!*

## РАСКАЗАЎ ВЕТЭРАН МАЛАДЫМ



ЗАКОНЧЫЛІСЯ тры пары заняткаў, аднак многія студэнты біялагічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў не спяшаліся разысціся па дамах і інтэрнатах. Яны сабраліся ў аўдыторыі 4-3 першага вучэбнага корпуса. Напярэдадні выбараў у Вярхоўны Савет СССР на сустрэчу да іх прыйшоў ветэран партыі з 55-гадовым стажам, кавалер ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, прафесар Ф. М. Харытановіч. Фёдар Мікалаевіч выказаў падзяліцца сваімі ўспамінамі перад маладымі выбаршчыкамі аб асабістым удзеле у першых выбарах у вышэйшы орган Савецкай улады, а таксама аб выбарах іншых скліканняў.

Калі праходзілі першыя выбары ў Вярхоўны Савет СССР, Ф. М. Харытановіч працаваў у Харкаве дырэктарам Украінскага навукова-даследчага інстытута агралесамеліярацыі. Глыбокія ўражанні засталіся ў вучонага ад выбараў у Вярхоўны Савет 5-га склікання. Ён працаваў тады намеснікам дырэктара па навуковай частцы Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута лесаводства і механізацыі лясной гаспадаркі, які размяшчаўся пад Масквой у г. Пушкіна. Фёдар Мікалаевіч быў дэпутатам гарадскога Савета. Яму пашчасціла весці перадвыбарны сход, на якім выбаршчыкі сустракаліся са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР вядомым савецкім пісьменнікам Л. Леонавым. Расказаў ён і аб першых выбарах у заканадаўчы орган Краіны Саветаў, якія праходзілі ў 1970 годзе ў нядаўна створаным Гомельскім дзяржаўным універсітэце, дзе Фёдар Мікалаевіч працаваў прарэктарам ГДУ па вучэбнай рабоце, з'яўляўся старшынёй выбарчай камісіі.

Успаміны ветэрана партыі і працы аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР маладыя выбаршчыкі выслухалі з вялікай увагай.

Кіраўнік агітцэнтра універсітэта В. Ф. Маслюкоў ад імя ўсіх прысутных шчыра падзякаваў Ф. М. Харытановічу за цікавы расказ.



**НА ЗДЫМКАХ: 1. Перад маладымі выбаршчыкамі выступае прафесар Ф. М. Харытановіч. 2. З захапленнем студэнты слухаюць цікавы расказ ветэрана.**

Фота С. Коваля.



У агітцэнтры універсітэта.

Фота С. Коваля.

*Ленінскі ўрок*

## ЖЫЦЦЁ, АДДАДЗЕНАЕ БАРАЦЬБЕ

На мінулым тыдні ў студэнцкіх групах матэматычнага факультэта прайшлі Ленінскія ўрокі, прысвечаныя 115-й гадавіне з дня нараджэння Надзежды Канстанцінаўны Крупскай — буйнага палітычнага, савецкага і дзяржаўнага дзеяча, сябра, жонкі і паплечніка Уладзіміра Ільіча Леніна.

У групе М-36 на Ленінскім уроку выступіла Ірына Карэбіна, якая расказала аб тым, як магла Н. К. Крупская працаваць з людзьмі, адстойваць свой пункт гледжання, якой вялікай павагай карысталася ў камуністаў, моладзі.

Студэнты даведаліся шмат цікавага аб жыцці гэтай выдатнай жанчыны, аб неацэннай дапамозе і падтрымцы, аказанных ёй Уладзіміру Ільічу ў нялёгкія дні ссылак і на працягу ўсяго іх жыцця.

**В. НЕКРАШЭВІЧ,**
**намеснік сакратара камсамольскага бюро матэматычнага факультэта па ідэалагічнай рабоце.**

## УЗНАГАРОДЫ—ЛЕПШЫМ

Дружыннікі нашага універсітэта на працягу многіх гадоў актыўна ўдзельнічаюць у ахове грамадскага парадку. Дружына ГДУ і лепшыя дружыннікі неаднаразова заахвочваліся органамі міліцыі, адміністрацыяй, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за мінулы навучальны год лепшымі прызнаны добраахвотныя народныя дружыны эканомфака, факультэта фізічнага выхавання і матфака. Пры яго падвядзенні ўлічвалася колькасць чалавека-выхадаў на дзяжурствы, удзел у забеспячэнні парадку на універсітэцкіх вечарах, публікацыі ў шматтыражнай газеце «Гомельскі універсітэт» і г. д.

Пераможцы спаборніцтва атрымалі ўзнагароды ва ўрачыстай абстаноўцы ў гонар 25-годдзя ўтварэння ў нашай краіне добраахвотных народных дружын. Ганаровых грамат рэктарата, парткома і прафкома ўдастоены загадчык лабараторыі кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, член партбюро эканамічнага факультэта У. А. Чмых, член партбюро матэматычнага факультэта асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі А. Ф. Васільеў і студэнт гістфіла А. Горбач. Кіраўнік ДНД факультэта фізвыхавання С. П. Сямёнаў, выкладчык гэтага факультэта В. М. Адзінцоў і студэнт эканамічнага факультэта М. Шпакоўскі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі аддзела ўнутраных спраў Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

Актыўная дзейнасць 21 дружынніка заахвочана грашовымі прэміямі. Вялікая група студэнтаў і выкладчыкаў узнагароджана Ганаровымі граматамі камітэта камсамола ГДУ. Многім дружыннікам аб'яўлена падзяка раённага штаба ДНД.

Ёсць упэўненасць, што з такім жа высокім пачуццём грамадскага абавязку будуць адносіцца дружыннікі універсітэта да даручанай справы і на працягу ўсяго бягучага навучальнага года.

**В. ТРУХАЎ,**
**кіраўнік ДНД ГДУ,**
**дацэнт кафедры АМАЭІ.**

## АТРАДЫ РЫХТУЮЦЦА

Ва універсітэце працягваецца актыўная падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра-84. У апошнія дні лютага камітэтам камсамола, штабам працоўных спраў ГДУ праведзен «Тыдзень лектара СБА». Адбылася таксама нарада камандзіраў будатрадаў, на якой абмеркавана пытанне аб удзеле байцоў СБА у барацьбе з правапарушэннямі ў горадзе.

Упершыню ў час падрыхтоўчага перыяду кожны студэнцкі атрад бярэ на сябе абавязацельства прыняць удзел ва ўзвядзенні спартыўных збудаванняў г. Гомеля. На працягу сакавіка-мая ў свабодны ад заняткаў час будуць прыходзіць студэнты на будаўнічыя аб'екты — спартыўныя пляцоўкі ў зарэчнай зоне адпачынку, прыбудовы да спартыўнага комплексу стадыён «Гомсельмаш», іншыя спартыўныя збудаванні.

Сёлета ў кожны атрад, акрамя тых, працоўнае лета якіх пройдзе на прадпрыемствах горада Гомеля, будуць залічаны байцамі па 3 цяжкавыхоўваемыя падлеткі з сярэдніх школ, ПТВ горада. На фізічным і гісторыка-філалагічным факультэтах ужо сфарміраваны атрады макаранкаўскага напрамку, у якіх летам будуць працаваць і многае пераасэнсоўваць у сваім жыцці па 15 цяжкіх падлеткаў.

# У гонар 40-годдзя вызвалення Беларусі

Раённы камітэт ЛКСМБ Цэнтральнага раёна г. Гомеля распрацаваў умовы сацыялістычнага спаборніцтва камсамольцаў і моладзі за права быць сфатаграфаванымі ля разгорнутага Чырвонага сцяга раённай камсамольскай арганізацыі ў гонар 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Мэта спаборніцтва заключаецца ў забеспячэнні актыўнага ўдзелу камсамольцаў і моладзі напярэдадні знамянальнай даты ў выкананні дзяржаўных планаў і заданняў бягучага года пяцігодкі, паспяховай вучобы студэнтаў і навучэнцаў.

**АСНОЎНЫМІ ЎМОВАМІ СПАБОРНІЦТВА З'ЯЎЛЯЮЦЦА:**

— выкананне сацыялістычных абавязацельстваў, добрая і выдатная вучоба;

— удзел у тэхнічнай творчасці, рацыяналізатарстве і вынаходніцтве;

— удзел у руху за камуністычныя адносіны да працы;

— актыўны ўдзел у грамадскім жыцці;

— выкананне асабістых комплексных (творчых) планаў — сацыялістычных абавязацельстваў удзельніка Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!»;

— павышэнне свайго палітычнага, агульнаадукацыйнага і тэхнічнага ўзроўню.

Для правядзення спаборніцтва ў кожнай пярвічнай камсамольскай арганізацыі ствараецца камісія.

Падвядзенне прамежкавых вынікаў індывідуальнага спаборніцтва праводзіцца ў камсамольскай арганізацыі за кожныя 15 дзён. Пераможцу гэтага этапа ўручаецца пераходны мандат, яго імя заносіцца на экран спаборніцтва.

Да 25 чэрвеня 1984 года камсамольская арганізацыя на адкрытым сходзе вызначыць пераможцаў па якасці пераходных мандатаў.

Камітэт камсамола ГДУ да 1 ліпеня 1984 года прадставіць у райком ЛКСМБ прозвішчы студэнтаў, якія будуць прызнаны пераможцамі спаборніцтва.

Пераможцы спаборніцтва ўдастояцца права быць сфатаграфаванымі ля разгорнутага Чырвонага сцяга раённай камсамольскай арганізацыі. Яны ўзнагароджваюцца таксама граматамі райкома ЛКСМБ, а іх прозвішчы заносяцца ў кнігу Гонару раённай камсамольскай арганізацыі

Пераможцы спаборніцтва будуць узнагароджаны граматамі камітэта камсамола універсітэта і каштоўнымі падарункамі.

Сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар знамянальнай даты набывае ў нашым універсітэце шырокі размах. Першымі і найбольш актыўна ўключыліся ў яго камсамольцы матэматычнага, гісторыка-філалагічнага і біялагічнага факультэтаў.

Імкненне дастойна сустрэць слаўнае 40-годдзе з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў павінна садзейнічаць якаснаму павышэнню паспяховасці студэнтаў, іх актывізацыі ў грамадскай дзейнасці, узорнай падрыхтоўцы да працоўнага семестра-84.

**А. КУСЯНКОЎ,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ.**

*Векапомнае*

## У паветры над Рагачовам

Наступальныя дзеянні войскаў Беларускага фронту ў пачатку 1944 года па вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працягвалі пашырацца і разгортвацца і ўвайшлі выдатнай старонкай у летапіс Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля разгрому ў студзені 1944 года мазырскай групіроўкі ворага 21 лютага войскі 3-й і 50-й армій фронту прыступілі да ліквідацыі варожага плацдарма на левым беразе Дняпра ўсходней г. Рагачова і Жлобіна. У гэтай аперацыі актыўна ўдзельнічаў і 79-ы гвардзейскі Мазырскі штурмавы авіяцыйны полк, які сваімі баявымі дзеяннямі з паветра дапамагаў часцям і злучэнням войск фронту пераадольваць супраціўленне праціўніка.

Полк знішчаў варожыя танкі, артылерыю, жывую сілу, а таксама яго рэзервы, не дапускаючы іх да поля бою, інтэнсіўна вёў разведку. У выніку гэтых дзеянняў войскі фронту ліквідавалі нямецкі плацдарм, фарсіравалі Днепр і 24 лютага вызвалілі важнейшы вузел супраціўлення ворага на бабруйскім напрамку — горад Рагачоў, перарэзалі чыгуначную лінію Магілёў — Жлобін і на правым беразе названай рэчкі захапілі плацдарм каля 60 км па фронту і 25 км у глыбіню.

79-ы гвардзейскі штурмавы полк за чатыры дні гэтай аперацыі нанёс вялікія страты ворагу. Некалькі экіпажаў страціў і сам. Баі былі вельмі цяжкімі і жорсткімі. Вораг супраціўляўся з усіх сіл. Многія яго апорныя пункты добра прыкрываліся шматслойным агнём зенітнай артылерыі. У паветры іншы раз нечакана з'яўляліся знішчальнікі праціўніка. Яны прымянялі тактыку нападзення «з-за вугла», карыстаючыся воблачнасцю. У гэтыя дні неба пераважна было зацягнута нізкімі воблакамі, часта падаў снег. Так было і 22 лютага, калі група з шасці экіпажаў самалётаў ІЛ-2 у саставе: Скачкоў А. М. — **Ягораў, Каламіец А. І. — Кандрашоў Ю. І., Карпуцін І. П. — Пастрэвіч, Снегіроў І. І. — Куцейкін М. Ф.,** Ваяводзін П. П. — Кабялко В., Архіпаў М. І. — Рабаў П. І. (першым указваецца прозвішча лётчыка, другім — стралка) у пятай гадзіне дня вылецела на штурмоўку мінамётна-артылерыйскіх батарэй у раёне апорнага пункта Хутары Кашырскія, што паўднёва-заходней г. Рагачова. У той дзень гэта быў іх трэці баявы вылет. Падлятаючы да цэлі, група знішчальнікаў, у літаральным сэнсе слова, сустрэлася з морам зенітнага агню. Аднак штурмавікі імкліва рынуліся на пазіцыі ворага. Унізе ўсё клекатала, кіпела, гуло, бліскала ад разрываў бомб і снарадаў, скінутых са штурмавікоў.

Цяжкія машыны насіліся над зямлёй з такой хуткасцю, быццам, гэта былі не «лятаючыя танкі», як ахрысцілі ІЛ-2 і сябры і ворагі, а чорныя маланкі, спапяляючыя ўсё на сваім шляху.

Мінамётныя, артылерыйскія і зенітныя батарэі праціўніка былі знішчаны. Савецкія мужныя арлы сабраліся ў групу і ўзялі курс на свой аэрадром. Але ў гэты час з-за воблакаў, сярод якіх утварылася «акно», выскачылі дванаццаць варожых знішчальнікаў і накінуліся на нашых штурмавікоў, якія не мелі прыкрыцця. Завязаўся няроўны бой. Першым быў збіты самалёт лётчыка І. І. Снегірова (ураджэнец в. Карнолін Даўгалескага сельсавета Гомельскага раёна). Падаючы на зямлю, бясстрашны пілот накіраваў свой самалёт у групу варожых аўтамашын і салдат, якія рухаліся ў той момант па вёсцы Забалоцце. Цаною свайго жыцця і жыцця паветранага стралка М. Ф. Куцейкіна ён нанёс значныя страты ворагу. У той жа час стралок з экіпажа М. І. Архіпава П. І. Рабаў трапнымі стрэламі падпаліў нямецкі знішчальнік. Але, на жаль, і іх самалёт быў збіты. Ён **упаў на поле паміж** вёскамі Зялёны Дуб і Забалоцце. Мясцовыя жыхары пахавалі абодва экіпажы на месцы гібелі. Пазней перазахавалі іх у брацкую магілу ў вёсцы Забалоцце.

У гэтым баі быў збіты і трэці савецкі штурмавік. Яго атакавалі два фашысцкія знішчальнікі. Адказаў матор. Лётчык Каламіец развярнуўся ў напрамку в. Стронькі. Ён хацеў пасадзіць самалёт на поле, але перавярнуўся. Паветраны стралок быў забіты. Лётчык А. І. Каламіец аказаўся цяжка параненым. На другі дзень ён памёр. Праз пэўны час яго астанкі перанеслі ў брацкую магілу в. Дварэц.

Усе гэтыя падрабязнасці выяўлены следапытамі атрада «Пошук» ГПТВ-56 г. Гомеля ў 1982 годзе. Пра подзвіг мужных савецкіх воінаў ім расказалі відавочцы гэтага паветранага бою, якія жывуць у в. Забалоцце і іншых суседніх з ёй вёсках. Сабраныя звесткі пацверджаны архіўнымі дакументамі Міністэрства абароны СССР. Дарэчы, загінуўшыя лётчыкі і стралкі, прозвішчы якіх мы назвалі, лічыліся прапаўшымі без весткі. Цяпер іх прозвішчы ўвекавечаны на помніках брацкіх магіл.

Сваякі загінуўшых таксама адшуканы членамі атрада «Пошук» ГПТВ-56. Летась яны наведалі месца захавання мужных сокалаў і ўзялі з сабой з Гомельшчыны свяшчэнную зямлю з брацкіх магіл.

Бясстрашныя, мужныя воіны, аддаўшыя сваё жыццё за незалежнасць і шчасце нашай Радзімы, жывуць у сэрцах сваіх родных, блізкіх, баявых таварышаў. Пра гібель названых аднапалчан мы даведаліся на трэцяй сустрэчы ветэранаў-франтавікоў 79-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка, якая адбылася ў мінулым годзе ў Рэчыцы.

**А. БАСКАКАЎ,**
**падпалкоўнік у адстаўцы,**
**былы лётчык 79-га штурмавога авіяпалка,**
**выкладчык кафедры ГА і медпадрыхтоўкі ГДУ.**

